Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Глыбокім судзяць журналістаў за сюжэт, якога яны не рабілі

18.05.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Таццяна Смоткіна і Зміцер Лупач

Ініцыятарам пераследу **Таццяны Смоткінай і Змітра Лупача** выступіла міжраённае аддзяленне КДБ.

Як паведамляе прэс-служба ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў", недзяржаўных журналістаў вінавацяць у працы без акрэдытацыі на польскі тэлеканал “Белсат”. Аднак сама Таццяна Смоткіна кажа, што наогул ніколі ў жыцці не супрацоўнічала з "Белсатам", і ў сюжэце выступае акурат у якасці героя — жыхара злашчаснага дома.

Тэлесюжэт пра неабходнасць капітальнага рамонту ў доме, дзе жыве Смоткіна, выйшаў у эфір 13 красавіка. У ім журналісты апытваюць жыхароў шматпавярховіка, у кадры роўна на 5 секунд з’яўляецца Таццяна, паказваючы калегам жахлівы стан камунікацый у доме. Аўтарам сюжэту пазначаны Сяргей Пятрухін.

Нягледзячы на гэта, супрацоўнікі міліцыі склалі супраць Смоткінай і яшчэ аднаго журналіста з Глыбокага — Змітра Лупача — адміністрацыйныя пратаколы за працу без акрэдытацыі, паводле якіх журналістам сёння могуць вынесці штраф ад 20 да 50 базавых велічыняў.

Пачатак працэсу а 15:00.

Твитнуть









Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY